беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

# НАША НІВА

КУЛЬТУРА, ПАЛІТЫКА

выходзіць у панядзелкі

№ 22 (60)
26 жніўня 1996 г.
панядзелак

ТЭЛЕПРАГРАМА

БІРЖА ПРАЦЫ

# Краіна мяняе статус

У пятніцу Дзярждэпартамэнт ЗША даў палітычны прытулак лідару БНФ Зянону Пазьняку і прэс-сакратару Фронту Сяргею Навумчыку. Пазьняк і Навумчык сталі першымі з грамадзянаў былога СССР, якія афіцыйна атрымалі ў ЗША статус палітычных уцекачоў пасьля 1991 г. Неўзабаве ў Кангрэсе ЗША адбудуцца слуханьні пра сытуацыю з правамі чалавека ў Беларусі.

Рашэньне Дзярждэпартамэнту публічна асудзіў палкоўнік Замяталін. А яшчэ за дзень да гэтага А.Лукашэнка заявіў агенцтву AP, што нідзе і ніколі не стаяла пытаньне пра арышт Пазьняка. «Для меня не существует лучшего руководителя оппозиции, чем этот обанкротившийся политик», — сказаў А.Лукашэнка.

Між іншым, гэтае інтэрвію для AP сьведчыць пра тое, як актыўна лабіраваў лукашэнкаўскі рэжым справу з палітычным прытулкам Пазьняка. Гэта ў інтэрвію для нашай газэты пацьвердзіў і сам З.Пазьняк («НН», 19 жніўня). Але нават афіцыйная заява А.Лукашэнкі не дапамагла. Рэжым прайграў. І цяпер у лепшых савецкіх традыцыях выстаўляе амэрыканцаў гэткімі «мальчышамі-плахішамі», якія прымаюць неабдуманыя рашэньні.

Але досьвед паказвае, што падобныя рашэньні Дзярждэпартамэнт ЗША рыхтуе вельмі грунтоўна. Цяжка згадаць хоць адзін прыклад памылковага прызнаньня статусу палітычнага ўцекача для людзей з нашага рэгіёну. Наадварот, як правіла, такія ўцекачы становяцца духоўнымі настаўнікамі сьвету. Дастаткова прыгадаць расейцаў Салжаніцына і Бродзкага, паляка Мілаша, літоўца Венцлаву...

Зразумела, што пры падрыхтоўцы рашэньня Дзярждэпартамэнту пераглядалася ўся сыстэма адносінаў ЗША (і ўсяго заходняга сьвету) да Беларусі. Пераглядаліся ўсе ранейшыя эканамічныя, палітычныя ды іншыя пагадненьні. Мяняўся статус РБ у сьвеце. Мы сталі адзінай краінай Эўропы, дзе пераследуюць за погляды, дзе ў турмах сядзяць паэты, дзе спэцназ разганяе жалобную працэсію, дзе страляюць у спартовыя шары і разбураюць помнікі, дзе прэзыдэнт публічна абражае мову свайго народу і прафануе гістарычныя сымбалі.

Пазьняк і Навумчык выканалі сваю палітычную місію. Аўтарытарны антыбеларускі рэжым РБ названы сваім імем на самым высокім узроўні. Побач з гэтым вынікам развагі пра тое, што лідар апазыцыі пакінуў сваю краіну, ратуе сваё жыцьцё або «збанкрутаваў», гучаць як палітыканства або блеф.

Пазьняк выехаў, але і мы ўсе не засталіся на месцы. Мы пераехалі ў іншую эпоху, народжаную хворай настальгіяй па таталітарным СССР. І сьвет прызнаў гэта.

Беларускі шлях да незалежнасьці атрымаўся не праз дэмакратызм, розум і вернасьць нацыянальным традыцыям, а праз звыродлівасьць рэжыму, якому цяпер ніхто не захоча падаць руку. Заходу сябраваць з РБ будзе брыдка, Усходу — нявыгадна. На пабытовым узроўні сьвет будзе асацыяваць з А.Лукашэнкам кожнага з нас, беларусаў. Мы становімся сувэрэннымі дэ факта і ўся праблема толькі ў тым, як хутка нам надакучыць чырванець ад сораму.

Рэдактар



# Чырвоны тэрор

### За кожнага камуніста — 1000 закладнікаў

Сёньня ніхто ўжо ня схільны ідэалізаваць мінуўшчыну, зьвязаную зь дзейнасьцю «жалезнага органа» пралетарскай дыктатуры — Усерасейскай надзвычайнай камісіі па барацьбе з контррэвалюцыяй, спэкуляцыяй і службовай злачынасьцю. Што ж уяўляла сабою ВЧК? З кім змагалася і каго карала?

*Пра гэта — на старонцы 3.*

# Славамір Адамовіч

«Рэпартаж з 4-й камэры» — турэмны дзёньнік паэта, арыштаванага КГБ за верш «Убей президента». Як вядома, Славамір Адамовіч пераведзены ў Віцебск, дзе ў верасьні над ім адбудзецца суд. Сёньня паэт чакае працэсу і распавядае пра сваё турэмнае жыцьцё.

*Старонка 14.*

# Палякі ад нас адвярнуліся

Паводле апошніх статыстычных апытаньняў на тэму любімых і нелюбімых народаў у Польшчы беларусы выйшлі на трэцяе месца сярод тых, з кім не хацелася б мець справу. Нас у брыдкасьці для палякаў апярэджваюць толькі баўгары і ізраільцяне, а мы, у сваю чаргу, брыдчэйшыя за расейцаў, сэрбаў, украінцаў, румынаў і цыганоў. Такія апытаньні ў Польшчы праводзяцца рэгулярна, і наш рэйтынг у іх стала падае. З талерантных і працавітых «брацішкаў» у вачах палякаў мы ператвараемся ў тых, ад каго варта трымацца чым далей.

Што да рэйтынгу любімых палякамі народаў, то тут лідары — італьянцы, французы, амэрыканцы, ангельцы, швэды, аўстрыякі і японцы. Далей ідуць вугорцы, чэхі і славакі. Рэзка палепшылі свой польскі рэйтынг немцы і літоўцы, якія перабраліся ў любімыя з разраду нелюбімых народаў.

*Паводле «Gazety Wyborczej», 19 жніўня.*

### Афганістан

# Забытая вайна

Нядаўняе адкрыцьцё помніка на Востраве Сьлёзаў у Траецкім Прадмесьці ў Менску яшчэ раз нагадала, што ў Беларусі пра афганскую вайну забудуцца ня хутка. Але ва ўсім астатнім сьвеце пасьля таго, як 15 лютага 1989 г. Афганістан пакінуў апошні савецкі салдат, пра гэтую краіну папросту забыліся. Хіба толькі раз-пораз расейскія СМІ зларадна паведамляюць пра тое, як апазыцыйныя Талібан пасьпяхова ваюе з былымі маджахедамі — колішнімі ворагамі СССР. Ці тыя ж маджахеды час ад часу згадваюцца ў зьвязку зь іх магчымым удзелам у чачэнскай вайне. З нагоды нядаўняга пабегу сямёх палонных расейскіх лётчыкаў зноў быў згаданы Талібан, гандаль зброяй, замежныя спэцслужбы ды нейкія ўнутрыдзяржаўныя інтрыгі. Дык што ўвогуле адбываецца цяпер у Афганістане?

У Афганістане працягваецца грамадзянская вайна. Пачалася яна яшчэ да ўводу савецкіх войскаў. Паміж сабою ваявалі мусульмане-суніты з мусульманамі-шыітамі ды пуштуны з таджыкамі. Змаганьне супраць адзінага ворага-інтэрвэнта СССР часова згуртавала розныя групоўкі, што разам здолелі такі дамагчыся незалежнасьці. Былыя палявыя камандзіры накшталт Ахмэда Шаха Масуда, што зрабіўся прэм'ер-міністрам, занялі салідныя дзяржаўныя пасты і пачалі самастойна кіраваць дзяржавай, заснаванай ужо не на марксісцкіх, як пры Кармале ці Наджыбуле, прынцыпах, а на ісламскіх.

*Працяг на старонцы 4.*

## навіны 1-м сказам

навіны 1-м сказам

**УКРАІНА.** У Кіеве 3-тысячным вайсковым парадам нацыянальных узброеных сілаў, які прыняў прэзыдэнт Кучма, урачыста адзначылі пяцігодзьдзе незалежнасьці Украіны.

**ЗАРОБАК-1.** Міністэрства статыстыкі паведаміла, што сярэдні заробак рабочых ды службоўцаў за ліпень 1996 г. склаў 1.173.136 руб. і павялічыўся ў параўнаньні зь леташнім ліпенем у 1,7 раза.

**ЗАРОБАК-2.** Рада Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларусі прапанавала ўраду падвысіць з 1 верасьня памер мінімальнага заробку да 150 тыс. руб.

**МАЗ.** На менскім аўтазаводзе завяршыліся выпрабаваньні новых мадэляў машын з рухавікамі амэрыканскіх кампаніяў «Дэтройт Дызэль» і «Нэвістар Інтэрнэшнл».

**МІР.** Харватыя ды Югаслаўская Фэдэрацыя падпісалі дамову пра нармалізацыю адносін, што фактычна азначае і ўзаемнае прызнаньне.

**ФРАНЦЫЯ.** Францыя распачала буйнамаштабную акцыю выдварэньня з краіны нелегальных афрыканскіх эмігрантаў, першая група якіх у колькасьці 57 чалавек была на самалёце адправленая ў невядомым кірунку.

**ЧАЧНЯ.** Аслан Масхадаў ды Аляксандар Лебедзь збольшага дамовіліся нарэшце спыненьня вайны ў Чачні; былі створаныя сумесныя расейска-чачэнскія вайсковыя групы для падтрыманьня парадку.

**ІЗРАІЛЬ.** Амэрыканскае ФБР адчыніла ў Ерусаліме свой новы офіс, супрацоўнікі якога будуць ня толькі змагацца з арабскім тэрарызмам, але й з расейскай мафіяй, дзейнасьць якой істотна пагражае нацыянальнай бясьпецы Ізраіля.

**ШПІЯНАЖ.** У выпрабавальным цэху кампаніі «Фольксваген», дзе распрацоўваліся новыя мадэлі аўтамабіляў, была знойдзеная схаваная камэра, што перадавала сакрэтную камэрцыйную інфармацыю праз спадарожнік.

**ПІЛІГРЫМЫ.** Больш за сотню індуісцкіх пілігрымаў да сьвятых мясьцінаў, зьвязаных з богам Шывай, замерзьлі ў Гімалаях.

**ТАЛАКА.** Гомельская Талака запрашае ўсіх на сьвяткаваньне сваіх 10-х угодкаў: 30 жніўня а 18.00 у залі музвучэльні імя Чайкоўскага (Гомель, вул. Жаркоўскага, 28) адбудзецца вечарына, фотавыстава і прэм'ера народнай драмы «Цар Максімільян»; 31 жніўня а 15.00 у Гомельскім парку (каля атракцыёнаў) — фальклёрная імпрэза. Тэлефон для даведак у Гомелі: 48-78-37.

### Літаратура

## Міхал Анемпадыстаў

# «Мая краіна пад белым сьцягам»

Міхал Анемпадыстаў піша свае вершы адмыслова для гурта «Новае Неба». Супрацоўніцтва лідара «НН» Касі Камоцкай і Міхала пачалося яшчэ пяць гадоў таму. І вось сёлета рыхтуецца да выхаду ўжо другі альбом «НН», створаны цалкам на вершы Міхала Анемпадыстава. Сёньняшняя нізка вершаў у «Нашай Ніве» — гэта тэксты некаторых песьняў з гэтага альбому.

........

**Здаецца, той дом стаяў на ўскраіне места**
**На вуліцы зь цёплага пылу і плотаў драўляных**
**Пад грушай вялікай, якая ўжо не радзіла**
**Затое давала шмат ценю ў летнюю сьпёку**

**Здаецца, той дом быў пабелены некалі вапнай**
**Ля дому быў кветнік, а ў ім незьлічоная кветкі**
**На тле белых сьценаў найлепей глядзеліся мальвы**
**Увогуле, мальвы заўсёды глядзяцца няблага**

**Здаецца, той дом меў блакітна-зялёныя дзьверы**
**Яго гаспадар з гаспадыняй былі ўжо вельмі старыя**
**Яны гаварылі пра сьмерць і пра кветкі**
**У доме была цішыня і павуцемра**

**Здаецца, у доме былі мы ня болей за колькі хвілінаў**
**Але, калі выйшлі адтуль, то было ўжо цёмна**
**У цемры быў прывідны водар ліпеяў і мяты**
**Паблізу ў ваду гучна падала кропля**

**Пазьней мы дарэмна чакалі апошні аўтобус**
**На вуліцы зь цёплага пылу і плотаў драўляных**
**Хацелі паліць, але ў нас не было запальнічкі**
**Хацелі вярнуцца ў дом, але нам не ставала нахабства**

*Астатнія вершы — на старонках 14-15.*

# Забароненае імя

Працягваючы Борхесаў беларуска-аргентынскі сюжэт зь мінулага нумару «НН», я хацеў бы зноў нагадаць эмацыйнае стаўленьне Галоўнага бібліёграфа да дыктатара Пэрона. Борхес у сваіх «Аўтабіяграфічных нататках» імкнуўся ня згадваць імя гэтага чалавека, у асобных выпадках называў яго Нязручнавымоўным. Зьява пазьбяганьня называць імя чалавека, якога ня любіш і з боку якога адчуваеш небясьпеку, стала пашыранай і ў сёньняшняй Беларусі.

Гартаючы ў «Архіве найноўшае гісторыі» заявы людзей, якія былі жорстка зьбітыя, альбо схопленыя міліцыяй у пэрыяд сёлетняй «Менскай вясны», я злавіў сябе на думцы, што рэпрэсаваныя практычна не называлі ў сваіх споведзях поўнага імя свайго галоўнага крыўдзіцеля. Адзін прыватны прадпрымальнік напісаў па-расейску, што 30 траўня ён знаходзіўся каля рэзыдэнцыі чалавека, «які займае пасаду прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі». Яшчэ адно вызначэньне — «наш прэзыдэнт», — стала ўласнасьцю выключна афіцыёзных масмэдыяў. Для сярэднестатыстычнага беларуса такое азначэньне — экзотыка. У неафіцыёзных колах для пазначэньня цяперашняга прэзыдэнта краіны існуе некалькі эўфэмізмаў. У прыватнай гутарцы часам дастаткова займеньніка «ён». У сябе, а таксама сярод кола маіх знаёмых, я таксама назіраў пэўныя псыхалягічныя перашкоды ў прамаўленьні гэтага імя. Цяпер пачынаеш разумець, што зьяўленьне ананімных паэмаў з пэрсанажам Лукою Мудзішчавым было выклікана ня толькі імкненьнем сыйсьці ад перасьледу, але й засьцярогамі іншага ўзроўню. Прынамсі, пра зьдзек альбо простае грэбаваньне тут не вядзецца.

У гэтым лінгва-псыхалягічным комплексе індустрыйнае Беларусі праглядаюцца архаічныя інстынкты й старажытныя абрады. Пазьбяганьне імя — гэта ягонае табуяваньне. Пры накладаньні табу пад сыстэмную забарону трапляюць пэўныя дзеяньні альбо назвы. Працэдура табуяваньня распаўсюджвалася на тыя звычаі й традыцыі, якія мелі адмоўны вынік для ўсяго грамадзтва. Табуяваньне — гэта перасьцярога ад злой сілы.

Сёньня несавецкі беларус пэрсаніфікуе зло. Гэтым самым беларус умешваецца ў найноўшы тэалягічны дыспут пра «Імя д'ябла». Пісьмовыя помнікі фіксуюць бясконцую колькасьць імёнаў сатаны: Люцыпар, Бафамэт, Мэфістофэль, Волянд... Дэманоляг XVI ст. Вэер называе нават дакладную лічбу — 44.635.569. Гэтая лічба ўжо сувымерная з колькасьцю сьмяротных. Адсюль высnova: сустрэчы чалавека з дэманам — не выключная зьява. Але мноства імёнаў — гэта таксама варыянт пазьбегнуць вымаўленьня толькі аднаго імя. Тэолягі-мадэрністы імкнуцца пазьбягаць прамой пэрсаніфікацыі д'ябла — Князь цемры разумеецца як Злы пачатак, які гнезьдзіцца ў прыродзе і ў чалавеку. Такі перавод праблемы ў іншы тэрміналягічны ўзровень абгрунтоўвае цюбінгенскі тэоляг Гербэрт Гааг: «Біблійны сатана — гэта пэрсаніфікаваны грэх. Паўсюль у Новым запавеце, дзе гаворыцца пра сатану й д'ябла, гэтае найменьне можна з такім жа посьпехам замяніць словамі «грэх» альбо «зло».

І вось беларуская прастора стала арэнаю змаганьня за імя. Нашыя старажытныя інстынкты абудзіліся, бо мы штодзённа бачым зло.

У рэаліях нашага зямнога жыцьця змаганьне ідзе за тэрыторыю. Такі прыземлены ход, у напрамку да зямлі, дае магчымасьць інтуітыўна ўлавіць у нашай падсьвядомасьці яшчэ адну падставу для табуяваньня — зло можа быць ня толькі анталягічным, яно не абавязкова сыходзіць непасрэдна ад д'ябла.

У многіх рэлігійных сыстэмах прысутнічае такі пэрсанаж, як трыкстэр (ашуканец). Гэтая істота можа выступаць заснавальнікам культурных звычаяў пэўнай групы людзей, але, як правіла, ня мае дачыненьня да чалавечага дабрабыту. У абарыгенаў Паўночнай Амэрыкі найбольш знаны ашуканец — каёт. Міт пра яго поўніцца сымболікай: «Ён скраў у духаў Сонца, Месяц і Зоры, але ня ведаў, што зь імі рабіць, дык павесіў іх у небе».

**Алег Дзярновіч**

"Наша Ніва"
незалежны тыднёвік
НАША НІВА

заснаваны ў 1906,
адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец Павал Жук
рэдактар Сяргей Дубавец
адказны сакратар Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
навіны Уладзімер Бараніч
рэдактар дадатку "Інфарматар" Андрэй Лапцёнак
макет Віктар Корзун
дызайн і вёрстка Лявон Раманчык
набор Таццяна Чуйвід
стыль Антон Кузьміч
карэктура Сяргей Сматрычэнка
пры ўдзеле Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)
АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78-49
Падпісны індэкс 63125
Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8. кв. 173.

# Палкоўнікам ніхто ня піша, або Лета патрыярха

Яшчэ ніколі ў жыцьці я не закатвала памідораў на зіму ў такім змрочным настроі.

Мабыць, і сапраўды мы блукаем па пустэльні. Адно, што розніць, — Маісей вёў свой народ да свабоды, а наш «прарок» — у адваротным накірунку ідзе. Але — кажу я сабе, разглядаючы кожны тамат і кідаючы беззаганныя ў слоік — але, як вясной сваімі ганебнымі кан'юктурнымі дзеямі ён зьяднаў беларускую НАЦЫЮ і даў імпульс нацыянальнай ідэі, так цяпер пагрозай дыктатуры кансалідуе беларускае ГРАМАДЗТВА.

Але які будзе кошт кансалідацыі?

Калі сёньня расейскія нацыяналісты, пляскаючы ў ладкі, сьпехам зьбіраюць пяць тысячаў сваіх — яны рана радуюцца. Мы яшчэ ўсе пабачымся ў канцлягеры — па адзін бок дроту, і будзе нас значна больш.

Калі расейскія палкоўнікі снуюць свае хітрыя пляны, маючы цьвёрдую надзею такім манерам дасягнуць вяршыняў — яны пралічваюцца. Той, у каго «ня ўсё толькі дрэннае», таксама прыйшоў да улады праз пуч — і аддзячыў сваім сябрам-палкоўнікам мерапрыемствам, якое атрымала назву «ноч доўгіх нажоў» — і штосьці ня памятаю, каб нехта пасьля яе застаўся ў жывых... Аднак лёс палкоўнікаў хвалюе мяне менш за ўсё — тым больш такіх хітрых — тым больш расейскіх...

Самае цяжкае ўражаньне апошняга часу: босы дзядок кланяецца, зьняўшы кепку, «Ікарусу», што едзе праз вёску...

Чаму, выпраўляючы мужа ў Амэрыку, дзе і грамадзтва сапраўды дэмакратычнае, і лёзунг «усё для чалавека» — ня словы, я кажу: «ну, вяртайся!» замест «ну, чакай мяне там»? Чаму, халера, не купляю кватэру ў Львове або Кіеве? Што трымае мяне тут — дзе глупства, хлусьня, зьдзекі? Дзе ўсё не маё — нават Радзіма?

*Можа, гэта асаблівы колер неба,*
*Можа — тут пражытыя гады —*

мэлянхалічна сьпявае Анджэй Русевіч — ён прайшоў эміграцыю, і гэтая пёсэнка была напісаная на радзіме Робіна Гуда.

Я начыста выціраю стол: а можа, ВС усё ж пацьвердзіць, што мы недарэмна яго выбіралі? І народ, можа, больш не паверыць хлусьні і штампам — і ня дасьць карт-бляшн дыктатару? А калі яго зноў ашукаюць? Што ж, дыктатура ўсюды аднолькавая — што ў Нямеччыне, што ў Парагваі, што ў Расеі. І ніхто з дыктатараў добраахвотна ад улады не адыходзіў.

... «Ікарус» даўно праехаў, а дзядок, падтанцоўваючы, усё кланяецца і кланяецца ўсьлед. Адна штаніна ў яго карацейшая за другую, а вецер трэпле валасы — белыя і рэдкія, як ў немаўляці.

**Натальля Бабіна**



# За «круглым сталом»

Падзея, што адбылася ў Менску на мінулым тыдні, выклікала розныя пачуцьці. Сапраўды, калі за «круглы стол» сядаюць БНФ і камуністы, гэта сьведчыць, што сытуацыя ў краіне далёка ня «круглая».

Пасьля вядомага звароту да грамадзтва сямі найбольш значных партыяў краіны, гэты крок выглядае лягічным. Партыі спрабуюць бараніцца ад А.Лукашэнкі, які не зважае на правілы. Падобна на тое, што супрацьстаяньне партыі — прэзыдэнт, парлямэнт —прэзыдэнт набывае новыя рысы. Прынцып «падзяляй і ўладар», які раней выдатна выкарыстоўваў А.Лукашэнка ў барацьбе за ўладу, трымаючы левыя партыі ў стане паўдаверу, здаецца, перастаў спрацоўваць. І камуністы, і аграрыі, пазбавіўшыся ад ілюзіяў, апынуліся за адным сталом з Фронтам і «грамадзянамі».

Прэзыдэнт зрэагаваў адразу. Усчата кампанія расколу камуністаў на прэзыдэнцкіх і непрэзыдэнцкіх, у супрацьвагу аграрыям ствараюцца саветы калхозаў. Як спрацуе прэзыдэнцкі падыход на нізавым партыйным узроўні, пакажа час. Пакуль жа лідар камуністаў Васіль Новікаў вялікай небясьпекі ў раскольных захадах ня бачыць, пра што і заявіў на паседжаньні «круглага стала». Наадварот, партыі знаходзяць паразуменьне паміж сабою. Тым больш, што кіраўнікі трох зь іх: аграрыяў, грамадзянаў і камуністаў складаюць кіраўніцтва Вярхоўнага Савету і маюць немалы досьвед.

Адсутнасьць харызматычнай фігуры Зянона Пазьняка аб'ектыўна спрыяе бязбольнаму ўваходжаньню ў гэтую кааліцыю БНФ.

Прэзыдэнт запрашэньне за стол праігнараваў. Зрэшты гэта нікога не зьдзівіла. Бакі даўно вызначылі свае пазыцыі, а інтарэсы выканаўчай улады прадстаўлялі спадары Лінг і Баранкевіч, і выглядалі, трэба сказаць, непераканаўча. Старшыня вэтэранаў пэнсіянэраў Баранкевіч сваімі выказваньнямі пра тое, як прэзыдэнт вядзе бітву за ўраджай, увогуле выклікаў здаровы сьмех у журналістаў.

Што тычыцца самога «круглага стала», то была ў ім пэўная сумбурнасьць. Шырокае прадстаўніцтва вялікай колькасьці палітычных партыяў і недзяржаўных прафсаюзаў (лідар дзяржаўных сп. Ганчарык знайшоў у гэты час больш пільныя справы) урэшце нічога не вызначала. З «сырасьцю» мерапрыемства пагадзіўся і Юры Хадыка, зазначыўшы, праўда, што паступова справа павінна наладзіцца.

Не было вызначана агульнай тактыкі дзеяньняў. Фронт і АГП прапанавалі рыхтавацца да пачатку працэдуры імпічмэнту. Прафэсар Багданкевіч абгрунтоўваў сваю прапанову тым, што «нас так ці інакш разгоняць, выканаўчай уладзе не патрэбныя законы, якія мы прымаем, дык хоць сыйдзем з годнасьцю. Ну зьбяруць нас на стадыёне, дык хоць пасядзім дастойна. Перавыхаваць гэтую асобу нельга». Сп. Булахаў прапанаваў тэрмінова ўнесьці папраўкі ў закон аб рэфэрэндуме і такім чынам паўплываць на сытуацыю. Гаварылі пра дадатковыя пытаньні, якія б нэўтралізавалі тое, што прапануе на плебісцыт А.Лукашэнка. З гэтым пагадзіўся Старшыня ВС Сямён Шарэцкі, сказаўшы, што парлямэнт ня можа адмовіць прэзыдэнту ў рэфэрэндуме, але мусіць выкарыстаць у гэтай сытуацыі свае правы, трымаючыся Канстытуцыі.

Прапанова імпічмэнту, выказаная з-за «круглага стала», выглядае даволі неперспэктыўна. Пры манаполіі на сродкі масавай інфармацыі любыя рэзкія, канфрантацыйныя дзеяньні апазыцыі А.Лукашэнка, як добры актор, выкарыстоўвае сабе на карысьць. Іншая справа — цягучая гульня з многімі невядомымі. Тут прэзыдэнт з сваім завадным характарам даволі часта трапляе ў нявыгадныя сытуацыі. Тым больш час аб'ектыўна працуе не на яго.

А.Лукашэнка чуйна й лісьліва рэагуе на сілу. Не зьявіўшыся на «круглы стол», ён паказаў, што не баіцца апазыцыі, пакуль у яго ёсьць грошы на тое, каб спраўна падвышаць заробак сілавым структурам. Ён баіцца страціць любоў Масквы і баіцца тых беларускіх палітыкаў, хто мае там уплывовых сяброў. Згадваецца амаль істэрыка прэзыдэнта пасьля сустрэчы С.Шарэцкага з Я.Строевым у Арле. Вельмі красамоўна на гэтым фоне выглядае пазыцыя ня надта сьмелага раней сьпікера і ягонае па сутнасьці старшынство на «круглым стале». Пазыцыя С.Шарэцкага цьвярдзее на вачах. Ён абураецца тым, што міністар замежных справаў Расеі Прымакоў ведае зьмены Канстытуцыі Беларусі, якія Лукашэнка зьбіраецца прапанаваць на рэфэрэндум, раней за яго, Шарэцкага, і парлямэнт.

Між тым Масква якраз і трымае А.Лукашэнку, дзякуючы ягонаму вернападданству, калі нават на свой рэфэрэндум ён просіць «дабро» ў Прымакова. Але пры гэтым Масква мусіць шукаць запасны варыянт для заваднога прэзыдэнта і, магчыма, ужо знайшла яго. І скарыстае пры першым чарговым праколе сёньнешняга беларускага фаварыта. Што гэта такое, А.Лукашэнка ведае, бо сам быў запасным пры Кебічы. Прысутнасьць і упэўненасьць С.Шарэцкага разам са сваёй партыяй на «круглым стале», верагодна, і стала галоўным вынікам гэтага «круглага стала».

**Алег Дашкевіч**

# ЧЫРВОНЫ ТЭРОР

## За кожнага камуніста — 1000 закладнікаў

Сёньня ніхто ўжо ня схільны ідэалізаваць мінуўшчыну, зьвязаную зь дзейнасьцю «жалезнага органа» пралетарскай дыктатуры — Усерасейскай надзвычайнай камісіі па барацьбе з контррэвалюцыяй, спэкуляцыяй і службовай злачынасьцю. Што ж уяўляла сабою ВЧК? З кім змагалася і каго карала?

Сьпярша галоўнай задачай ВЧК была барацьба з контррэвалюцыяй і сабатажам. Пасьля да гэтага дадалася барацьба з спэкуляцыяй і службовымі злачынствамі, шпіянажам, падаўленьне контррэвалюцыйных выступаў, бясьпека транспарту і Чырвонай Арміі, ахова дзяржаўнай мяжы. Быццам бы ўсё зразумела. Але на справе далёка ня ўсё было так адназначна і правільна.

Надзвычайная камісія — гэта органы не суда, а «бязьлітаснай расправы», паводле тэрміналёгіі ЦК РКП(б). «Гэта ня сьледчая камісія, ня суд і не трыбунал», — вызначала задачы ЧК сама надзвычайная камісія. «Гэта орган баявы, які дзейнічае на ўнутраным фронце грамадзянскай вайны. Ён ворага ня судзіць, а паражае. Ня літуе, а спапяляе кожнага, хто па той бок барыкадаў».

Няцяжка ўявіць сабе, як мусіла чыніцца гэтая «бязьлітасная расправа», калі замест «мёртвага кодэксу» законаў дзейнічае толькі «рэвалюцыйны досьвед» і «сумленьне». Сумленьне суб'ектыўнае. І досьвед непазьбежна замяняецца самавольствам, якое набывае дзікія формы ў залежнасьці ад складу выканаўцаў.

Тэрор ператвараецца ў крывавую бойку, якая першым часам выклікала абурэньне нават у камуністаў. Фармальнай падставай разьвязваньня чырвонага тэрору стаў замах на Леніна ў канцы жніўня 1918 г.

«Красная газета» пісала пра гэта 1 верасьня: «Сотнями будзем мы забіваць ворагаў. Няхай будуць гэта тысячы, няхай яны захлынуцца ва ўласнай крыві. За кроў Леніна і Ўрыцкага няхай пральюцца патокі крыві — больш крыві, столькі, колькі магчыма». «Пралетарыят адкажа на раненьне Леніна так, — пісалі «Известия», — што ўся буржуазія здрыганецца ад жаху».

Ніхто іншы, як сам Радэк, сьцьвярджаў у «Известиях» у спэцыяльным артыкуле, прысьвечаным чырвонаму тэрору: «За кожнага савецкага работніка, за кожнага правадыра рабочай рэвалюцыі, які загіне ад рукі агента контррэвалюцыі, апошняя расплаціцца дзясяткамі галоваў». Калі мы ўспомнім крылатую фразу Леніна: няхай 90% расейскага народу загіне, абы 10% дажылі да сусьветнай рэвалюцыі, — то зразумеем, у якіх формах малявала ўяўленьне камуністаў гэтую «чырвоную помсту».

Наперадзе ўсіх ішоў сам Усерасейскі Цэнтральны Камітэт, які прыняў 2-га верасьня 1918 г. рэзалюцыю: «за кожны замах на дзеячоў савецкай улады і носьбітаў ідэяў сацыялістычнай рэвалюцыі будуць адказваць усе контррэвалюцыянэры і ўсе натхняльнікі іх».

У поўнай адпаведнасьці з пастановай ЦВК 5 верасьня 1918 г. выдаецца пастанова СНК у выглядзе спэцыяльнае ўхвалы дзейнасьці ЧК, паводле якой «трэба расстрэльваць усіх асобаў, якія маюць дачыненьне да белагвардзейскіх арганізацыяў, змоваў і мяцяжоў». Народны камісар унутраных справаў Пятроўскі разаслаў усім саветам тэлеграфны загад, які стаў гістарычным і паводле сваёй тэрміналёгіі, і паводле сваёй санкцыі ўсякага магчымага самавольства. Гутарка ідзе пра «Загад аб закладніках»:

«Забойства Валадарскага, забойства Ўрыцкага, замах на забойства і раненьне старшыні народных камісараў Уладзіміра Ільіча Леніна... змовы ў тыле нашых армій, адкрытае прызнаньне правых эсэраў і астатняй контррэвалюцыйнай сволачы ў гэтых змовах, і ў той жа час надзвычай нікчэмная колькасьць сур'ёзных рэпрэсій і масавых расстрэлаў белагвардзейцаў і буржуазіі з боку саветаў, паказвае, што, нягледзячы на пастаянныя словы пра масавы тэрор супраць эсэраў, белагвардзейцаў і буржуазіі, гэтага тэрору насамрэч няма.

З такім становішчам павінна быць рашуча скончана. Расхлябанасьці і міндальнічаньню павінен быць неадкладна пакладзены канец. Усе вядомыя мясцовым саветам правыя эсэры павінны быць неадкладна арыштаваныя. З буржуазіі і афіцэрства павінны быць узятыя значныя колькасьці закладнікаў. Пры найменшых спробах супраціву альбо найменшым руху ў белагвардзейскім асяродзьдзі павінен прымацца безумоўна масавы расстрэл...»

Пасьля загаду Пятроўскага наўрад ці варта нават казаць пра «рабочую клясу», якая нібыта выступала мсьціўцам за сваіх правадыроў, і пра гуманнасьць мэтаў. Які сэнс у сапраўднасьці можа мець заява нейкіх камуністаў Віцебскай губэрні, якія патрабавалі 1000 ахвяраў за кожнага савецкага работніка? Або патрабаваньне камуністычнай ячэйкі магілёўскага аўтацэхніка —за кожнага палеглага расстраляць 100 закладнікаў, за кожнага чырвонага 1000 белых. Альбо заява Камячэйкі Заходняй Вобласьці Надзвычайнай Камісіі, якая патрабавала 13-га верасьня «сьцерці з твару зямлі паскудных забойцаў». Альбо рэзалюцыя чырвонаармейскай часткі аховы Менскай ЧК: «За кожнага нашага камуніста будзем зьнішчаць па сотнях, а за замах на правадыра тысячы і дзясяткі тысяч гэтых паразітаў».

Мы бачым, як па меры аддаленьня ад цэнтру, крыважэрнасьць ЧК павялічваецца — пачалі з соцень, дайшлі да дзясяткаў тысячаў. Дзясяткі тысячаў нашых землякоў, такіх, як Ганна Калмакова, былі раскіданыя па прасторах Расеі. Розныя былі гэта людзі, але яднае іх адно — усе яны былі расстраляныя за «белагвардзейскую змову».

Калі знаёмісься з архіўна-сьледчымі справамі перыяду 20-30-х гадоў — усё да болю здаецца знаёмым. Тое ж надакучлівае вытырканьне анкетных «дадзеных», поўная бяздоказнасьць, якая падаецца як выкананьне законнасьці, «прышпільваньне» лёсаў адных людзей да справаў зусім ім невядомых асобаў. І, безумоўна, лютая жорсткасьць і бесчалавечнасьць прысудаў. Факты не пераўпарціш. Менавіта так былі пакладзены пачатак д'ябальскай эстафэце даўжынёю ў некалькі дзясяткаў гадоў.

# Ён, Яна і Надзвычайка

На пятым годзе перагляду прысудаў, што былі вынесеныя нашым забітым суайчыньнікам, першыя дасьледчыкі нарэшце дабраліся да тых пластоў, зь якіх бярэ пачатак эпоха тэрору «зьверху».

Сёньня у нас ёсьць магчымасьць пазнаёміцца з матэрыялаамі аднае з тысяч справаў, якая датуецца 1920-м годам. Пра гэты час прасьпявана столькі звонкіх песень і сказана столькі высокіх словаў! Але вось сьвятло ўпала і на гэты цёмны кут нашай мінуўшчыны. Успомнім пра адно караценькае жыцьцё, перарванае ў тым самым 20-м...

Яна глядзіць, як жывая, з выдатна захаванага фотаздымка. Прыгожая і маладая, на ўзьлёце шчасьця. Воляю Гісторыі кінутая ў нябыт, згубленая, як бязважкая пясчынка, у завалах архіўна-сьледчых справаў ЧК.

Год быў яшчэ 20-ы, а трыюмфатары-пераможцы ўжо цалялі ў маленькія чалавечыя сэрцы. Расстрэлы як форма стварэньня новай супольнасьці.

Ганна Маркава, дачка запаснога кананіра, нарадзілася 28 жніўня 1898 году ў вёсцы Валынцава Раманаўскай воласьці Горацкага павету Магілёўскай губэрні. У 1910 скончыла пачатковы курс у Нарваўскай вучэльні г. Санкт-Пецярбурга. Узровень дабрабыту сям'і не дазваляў утрымліваць малалетнюю дачку, і яна вымушана была працаваць пакаёўкай у адной заможнай сям'і.

Першая сусьветная вайна застала Ганну ў Петраградзе. У 1916 яна выйшла замуж за Сяргея Аляксеевіча Калмакова, які служыў у Петраградзе памочнікам обэр-сакратара 3-га дэпартамэнту Сэнату. Муж учарашняй гімназісткі пасьля мабілізацыі на нямецкую вайну працаваў чыноўнікам інтэнданцтва. У гэтым самым годзе ў іх нарадзіўся сын Міхаіл.


Томская Чрезвычайная Комиссия
АРХИВ
№ 2254
1920 года
ДЕЛО
По обвинению Калмаковой Анны Ивановны
в принадлежности к белогвардейской организации
№ 9321
Началось 14/V 1920 г.
Окончилось 29/VI 1920 г.

Кастрычніцкі пераварот не абмінуў сям'ю Калмаковых. У 1918 годзе Сяргей Калмакоў дэмабілізаваўся і, падхоплены віхурай рэвалюцыі, апынуўся з жонкай у Казані.

Да гэтага часу ў іх было ўжо двое дзяцей: двухгадовы Міхаіл і немаўля Ніна. У горадзе гаспадарылі чырвоныя, і бацька сям'і зарабляў на хлеб рахункаводам у гарадзкой управе. Але неўзабаве Казань адбілі белыя. Натуральна, што і паводле адукацыі, і паводле выхаваньня Сяргей Калмакоў, які напоўніцу спазнаў хамства рэвалюцыйных нізоў, быў непараўнальна бліжэйшы да афіцэрства, чым да камісараў! Пасьля ўзяцьця Пярмі ён становіцца сакратаром Вайсковага кантролю ў арміі Калчака.

Калі Чэхаславацкі корпус адкрыў фронт і выйшаў з вайны, белыя пачалі адступаць, і разам з Вайсковым кантролем Калмакоў эвакуяваўся ў Томск. Тут у 1919 годзе і адбываецца завязка трагедыі.

Ганна з двума дзецьмі засталася ў Томску. Яе муж вымушаны быў пакінуць горад з арміяй Калчака і рушыць далей на ўсход. Але ў дарозе ён захварэў і вярнуўся да сям'і. Там ён стаў жыць, хаваючыся ў жонкі і ў сваёй брата.

У абставінах разрухі 22-гадовай жанчыне з двума маленькімі дзецьмі на руках і мужам на ўтрыманьні трэба было забясьпечыць сям'і харчаваньне. Аднак, ня маючы спэцыяльнасьці, знайсьці працу ў той трывожны час было вельмі цяжка. Ганне пашанцавала: з рэкамэндацыі знаёмага яна ўладкавалася на службу ў... ЧК. Ці трэба тлумачыць, што не рэвалюцыйны запал, а горкая нястача штурханула яе на парог гэтай установы!


Р. С. Ф. С. Р.
Томская Чрезвычайная Комиссия по борьбе с контрреволюцией, спекуляцией и преступлениями по должности.
Удостоверение № 2245.
17/IV-20 г.
Предъявитель сего есть действительно т. Колмакова Анна Ивановна и состоит в должности регистратора общей канцелярии при Томской Чрезвычайной Комиссии по борьбе с контр-революцией.
Колмакова.
Собственноручная подпись на фотографии. Колмакова
Личность и собственноручная подпись т. в Колмаковой удостоверяется.
Председатель
Секретарь

Але, магчыма, так і было? Усё ж «палыхала грамадзянская вайна», аб якой мы ўсе ведаем з кніг і кінакарцін пра злодзеяў-белякоў і чырвоных герояў.

Так жонка афіцэра-ўцекача стала рэгістратаркай у канцылярыі агульнага аддзела Томскай Надзвычайнай Камісіі па барацьбе з контррэвалюцыяй, спэкуляцыяй і сужбовай злачынасьцю.

Але папрацаваць на гэтай пасадзе ёй удалося крыху больш за месяц. 13 траўня 1920 года Ганна была арыштаваная.

Падрабязнасьці пачатага сьледзтва сталі вядомыя толькі ў 1993 годзе. Працэдура была нядоўгая. Арыштаванай выставілі абвінавачаньне ў некалькіх «злачынствах». Пасьля доўгіх допытаў яна прызналася ў тым, што хавала мужа.

Але абвінавачаньне ў прыналежнасьці да белагвардзейскай арганізацыі жанчына катэгарычна адмаўляла, і, як ні стараліся рыцары рэвалюцыі «з чыстымі рукамі, гарачым сэрцам і халоднай галавой», ні аднаго доказу віны Калмаковай яны не здабылі. Зрэшты, гэта ўсім не зьбянтэжыла чэкістаў. На пустым месцы яны пачынаюць узводзіць цэлы будынак.

Адмовімся ад эмоцыяў і зьвернемся да сьледчых дакумэнтаў. І высьветліцца, што, як ні «калолі» няшчасную жанчыну яе былыя саслужыўцы, усё, што ім удалося зь яе вымучыць, — гэта прызнаньне, што яе «спрабаваў выкарыстаць у гэтым кірунку былы афіцэр Крывашэін, які абяцаў, што ёй гэта залічыцца з боку белагвардзейскіх арганізацый». Але «спрабаваў» яшчэ ня значыць «выкарыстаў».

Такім чынам, доказаў не было ніякіх. Затое быў данос альбо даносы невядомага зьместу ад невядомай асобы, імя якой засталося так і нераскрытым. Сяксот сыгналізаваў, што Калмакова дае белагвардзейцам зьвесткі пра ЧК. Ці значыла гэта, што яна расказвала мужу пра сваю працу? Можа быць. Сужэнец Ганны, які міжволі адыграў у яе лёсе такую злую ролю, напэўна жорстка расплаціўся за сваю «неадольную» цягу да хатняга агмяню. Ад яго застаўся толькі верш «Мольба», запісаны алоўкам на абрыўку паперы і адрасаваны жонцы. Вось толькі адно чатырохрадкоўе з яго: «Прости меня! Быть может, очень скоро я от тебя уйду без поцелуя рук. Весны познаю я тяжелые укоры, «Она» возьмёт меня в свой жадный тесный круг».

Датаваныя гэтыя радкі 25 сакавіка 1920 г. Калі пад словам «Она» Сяргей Калмакоў меў на ўвазе сьмерць, то ён наўрад ці памыліўся.

Што да Ганны Калмаковай, то яе ліс вырашаў нейкі ўпаўнаважаны па палітычных партыях, які ва ўсякі выпадак у дакумэнтах прозьвішча сваё не ўказваў. Праўда, пільныя чэкісты, напэўна, забыліся, што Ганна ніколі ні ў якой партыі не была.

Працэдура следзтва заняла крыху больш за месяц. Цяжка ўявіць, пра што думала Ганна ў гэтыя дні. Хутчэй за ўсё пра дзяцей, маці, мужа. І наўрад ці магла яна дапусьціць, што 24 чэрвеня 1920 году яе лёс быў ужо вырашаны. І чыесьці рукой ужо было накрэслена: «Лічачы абвінавачаньне Калмаковай даказаным, ужыць вышэйшую меру пакараньня — расстрэл».

У ноч на 25 чэрвеня 1920 году ў рове на паўночнай ускраіне Томска пагасла яшчэ адно чалавечае жыцьцё. Адно ў акіяне пралітай людзкой крыві...

# Небяспечныя лекі



**ТЭТРАЦЫКЛІН (пэдыятрычны)**

*Ярданія:* Міністэрства аховы здароўя забрала з продажу сыропавыя формы тэтрацыкліну (мікстура, суспэнзіі й кроплі), асабліва прызначаныя для пэдыятрычнага выкарыстаньня, з тае прычыны, што тэтрацыклін перашкаджае росту костак і зубоў у немаўлят (з 1973 г.)

*Італія:* Прэпараты для рэктальнага ўжываньня забралі з продажу з-за іхняга нераўнамернага ўсмоктваньня. З 1979 г. да цэтлікаў канцэнтраваных вадкіх прэпаратаў далучана папярэджаньне аб магчымым дысхромным узьдзеяньні на зубную эмаль (з 1975 г.)

*Аўстралія:* Усе пэдыятрычныя формы тэтрацыкліну забралі з продажу (красавік 1977 г.). Аналягічныя меры прыняты ў *Бэльгіі, Банглядэшы, Новай Зэляндыі, Саудаўскай Аравіі, Індыі* (з 1983 г.), на *Філіпінах* (з 1978 г.)

*ЗША:* Тэтрацыклінавыя кроплі для пэдыятрычнага ўжываньня забралі з продажу. Дактарам раяць не прызначаць вадкія прэпараты тэтрацыкліну і аналягічныя зь ім сродкі цяжарным жанчынам і дзецям да 9 гадоў (з 1978 г.).

*Камэнтар Сусьветнай Арганізацыі Аховы Здароўя (СААЗ):*

Тэтрацыклін накопліваецца ў костках і зубах, якія разьвіваюцца ў плода і маленькіх дзяцей. Гэта можа прывесьці да афарбоўкі зубоў і замаруджваньня росту костак. У шэрагу краінаў былі забароненыя вадкія прэпараты, прызначаныя спэцыяльна для дзяцей, а ў іншых краінах рэкамэндуюць дадаваць да цэтлікаў адпаведныя папярэджаньні, якія раяць не прызначаць тэтрацыклінавыя сродкі маленькім дзецям і цяжарным жанчынам. Непэдыятрычныя дазаваныя формы тэтрацыкліну застаюцца ў тыпавым сьпісе асноўных лекавых сродкаў СААЗ.

**ЭРЫТРАМІЦЫН ЭСТАЛЯТ**

*Данія:* Анулявана рашэньне на рэгістраваньне гэтых лекаў (1974)

*Пэру:* На цэтліках ці ўкладышах да лекаў павінна быць надрукавана папярэджаньне пра магчымае паражэньне пячонкі пры выкарыстаньні прэпарату. Пры шматразовым яго ўжываньні магчымыя пабочныя зьявы: ліхаманка, ташнота, ванітаваньне, жаўтуха й эозынафілія. На ўкладышах друкуецца таксама перасьцярога для цяжарных жанчын у тым, што дагэтуль ня вызначаны бясьпечныя канцэнтрацыі эрытраміцыну эсталяту, якія можна прымаць падчас цяжарнасьці.

*Швэцыя:* Забаронена выкарыстаньне й продаж гэтага прадукту ў краіне ў сувязі зь цяжкімі выпадкамі халестатычнай жаўтухі і паталягічнымі праблемі пячонкі. У Швэцыі не выпрабляецца.

*Камэнтар Сусьветнай Арганізацыі Аховы Здароўя:*

Хаця зьвесткі, атрыманыя сыстэмай спантаннага бягучага кантролю, сьведчаць пра тое, што гепатаксычнасьць можа часьцей назірацца ў пацыентаў, што прымаюць эрытраміцын эсталят, чым у пацыентаў, якія прымаюць іншыя солі і складаныя эфіры гэтага антыбіётыку, дадзенае пытаньне застаецца спрэчным. Прэпарат быў пакінуты на рынках некаторых краінаў, уключаючы ЗША, дзе да гэтых лекаў прыкладаецца ўкладыш з адпаведным папярэджаньнем.

**ГЕКСАХЛЯРАФЭН**

*Японія:* Камітэт лекавых сродкаў забараніў уключаць гексалярафэн у склад такія прэпаратаў, як дзіцячыя прысыпкі, бо ў досьледных жывёлаў гэтае рэчыва выклікала ацёк мозгу; забаронены экспарт прэпарату (з 1972 г.).

*Філіпіны:* Усе талькавыя дзіцячыя прысыпкі з болей, чым 0,75 % гексахлярафэна, зьнятыя з продажу, а іншыя лекавыя сродкі з больш высокай канцэнтрацыяй павінны адпускацца толькі праз рэцэпты (з 1972 г.).

*Турцыя:* Рашэньнем Міністэрства аховы здароўя выняты са складу ўсіх зубных пастаў у сувязі з паведамленьнямі пра адмоўныя рэакцыі на гексалярафэн ( з 1981 г.).

*ФРГ:* Заменены ў лекавых і касмэтычных прэпаратах іншымі складнікамі (з 1983 г.).

*Пэру:* Забаронена ўжываньне ў складзе гігіенічных прэпаратаў.

*Камэнтар Сусьветнай Арганізацыі Аховы Здароўя:*

Ужываньне гэксалярафэна ў якасьці антымікробнага рэчыва ў адпаведных вадкіх прэпаратах і прысыпках выклікала ў дзяцей энцэфаляпатыю, якая разьвілася ў выніку абсорбцыі гэтага рэчыва праз скуру. У многіх краінах накладзены строгія абмежаваньні на мэдычнаае ўжываньне гэтага прэпарату, асабліва ў леках, прызначаных для дзяцей. У нізкіх канцэнтрацыях ён шырока ўжываецца ў якасьці абарончага сродку ў гігіенічных і касмэтычных таварах.

**УРЭТАН**

*Данія:* Рэгістрацыя забароненая (з 1967 г.).

*Эгіпэт:* З-за магчымага канцэрагеннага ўзьдзеяньня прадукты з урэтанам зьняты з продажу (з 1975 г.).

*Японія* (з 1975 г.), *Тайлянд* (з 1975 г.), *ЗША* (з 1977 г.), *Італія* (з 1979 г.): Забаронена ўжываньне ў якасьці стабілізатара ці распушчальніка з-за ягонай канцэрагеннай прыроды. Экспарт у складзе лекавых прэпаратаў забароненны.

*ФРГ:* Забаронена рэгістрацыя ўсіх прадуктаў, у складзе якіх ёсьць урэтан, з-за магчымасьці канцэрагеннага ўзьдзеяньня.

*Камэнтар Сусьветнай Арганізацыі Аховы Здароўя:*

Урэтан ужываўся ў якасьці супрацьпухліннага сродка, снатворнага ў вэтэрынарнай практыцы і ў якасьці распушчальніка пры вырабе лекавых прэпаратаў. Ён валодае як мутагенным, так і канцэрагенным узьдзеяньнем. СААЗ ня мае інфармацыі пра тое, што ўрэтан застаецца ў продажы ў складзе лекавых прэпаратаў, прызначаных для ўжываньня людзьмі.



*Матэрыялы прадастаўлены ААН. Яны ёсьць у Зводным сьпісе тавараў, спажываньне і (ці) продаж якіх забаронены ці абмежаваны.*

# ЛЕКІ – ЗАБОЙЦЫ НА РЫНКУ

**Увага: два лекавыя прэпараты, што прадаюцца на рынку, могуць стаць прычынай сур'ёзных хваробаў сэрца і прывесьці да сьмерці**

Гэта "Teldane" ("Seldane") і "Hismanal". Паводле інфармацыі часопіса "The dancet" яны могуць выклікаць такую рэакцыю, як спыненьне сэрца, ці таксама пагрозу для жыцьця — сардэчную артымію (г. зн. зьмены ў нармальным рытме сэрцабіцьця). У ЗША як мінімум 13 сьмерцяў і 95 выпадкаў сур'ёзных хваробаў сэрца былі зьвязаныя з выкарыстаньнем гэтых лекаў. Калі вы купляеце лекі ад алергіі, хваробы скуры ці інфэкцыяў вачэй, пазьбягайце "Teldane" і "Hismanal".

У парадах, прыкладзеных да лекаў, няма папярэджаньняў пра магчымую небясьпеку. Наадварот, у адрозьненьне ад іншых прэпаратаў-антыгістамінаў, яны рэклямуюцца як тыя, што ня маюць другасных узьдзеяньняў — санлівасьць, вяласьць, ташнота, расстройства страўніка, галаўныя болі, каляровыя галюцынацыі, страта апэтыту і раздражняльнасьць. Зь непажаданых эфэктаў там узгадваюцца толькі выпадкі артыміі.



"Teldane" ("Seldane") прызначаны для лекаваньня алергічнага раніту (запаленьне сьлізістай абалонкі носа), сянной ліхаманкі й іншых алергічных захворваньняў, ён прызначаецца для дзяцей ад 3 гадоў і дарослых. Але вы павінны памятаць, што пацыенты, якія сумяшчаюць прыём лекаў з ужываньнем супрацьгрыбковых прэпаратаў, у складзе якіх ёсьць кетаназол (напрыклад, "Nisoral"), ці эрытраміцын, а таксама тыя, хто пакутуе на хваробы пячонкі ці прымае лекі звыш нормы, вельмі рызыкуюць.

"Histamanal" прызначаны для лячэньня пацыентаў з алергічным рынітам, алергічным кан'юнктывітам, хранічнай крапіўнай ліхаманкай (запаленьне скуры, сыпам з моцным зудам) і іншымі алергічнымі скуранымі захворваньнямі.

Вытворцы "Histamanal" атрымалі шэраг паведамляеньняў пра выпадкі арытміі, спыненьня сэрца й нават сьмерці пацыентаў, якія перавысілі дозу ў 10 мг. Большасьць гэтых выпадкаў была зьвязаная з вялікім перадазаваньнем, але артымія назіралася і пры прыёме невялікіх дозаў — 20 ці 30 мг.

Управа па леках і прадуктах (FDA) ЗША папярэджвае, што небясьпецы падвяргаюцца пацыенты з захворваньнямі пячонкі. Акрамя таго, былі атрыманыя паведамленьні пра магчымую рэакцыю астэмізола, які ўваходзіць у склад "Histamanal", з эрытраміцынам, якая прыводзіць да захворваньняў сэрца.

*Паводле матэрыялаў часопіса* ***"Consumer Interpol Memo"***

# Пасіўнае паленьне ня менш небясьпечнае

Пасіўнае паленьне – удыханьне дыму ад чужых цыгарэтаў, што завецца мэдыкамі паленьнем тытуню з навакольнай атмасфэры,– адбываецца пры трапленьні ў лёгкія струменьчыкаў дыму ад цыгарэты, якія тлеюць. У лябараторных умовах было ўстаноўлена, што наяўнасьць у іх атрутных і канцэрагенных рэчываў значна большая, чым у асноўнай плыні дыму, якую ўдыхае курэц.

**Як шмат?**

Падлічана, што дзеці тых, хто паліць, могуць удыхаць столькі ж дыму, як быццам яны самі выпальвалі па 100 цыгарэтаў на год (натуральна, што гэтая лічба залежыць ад таго, як шмат паляць бацькі, колькі часу дзіця праводзіць дома, як у кватэры праветрываюцца памяшканьні й г.д.). Дасьледаваньні паказалі, што ў сярэднім пасіўны курэц атрымлівае эквівалент адной-дзьвюх цыгарэтаў на тыдзень.

**Небясьпека падчас цяжарнасьці**

Дзіцёнак ці падлетак можа хоць зрэдку пазьбягаць пракураных памяшканьняў, але плод гэтага ня можа рабіць. Калі цяжарная жанчына паліць, плод пачынае пакутаваць ад узьдзеяньня тытунёвага дыму яшчэ да таго, як пабачыць сьвет.

Раней лічылася, што калі жанчына ня паліць падчас цяжарнасьці, то й на дзіцёнка ня ўзьдзейнічае нікатын. Аднак канадзкія навукоўцы, прааналізаваўшы хімічны склад валасоў і крыві дзяцей, маці якіх не палілі, але на якіх рэгулярна ўзьдзейнічаў цыгарэтны дым, выявілі павышаную колькасьць нікатыну й прадукту ягонага распаду, катыніну. Гэтыя дадзеныя даказваюць шкоднасьць пасіўнага паленьня для плода, і жанчынам, якія зацяжарылі ці плянуюць зацяжарыць, ёсьць сэнс пры магчымасьці пазьбягаць месцаў, дзе напалена, а навакольных трэба пераканаць, каб яны перасталі паліць у іхняй прысутнасьці.

**Наколькі гэта шкодна?**

*Сардэчныя захворваньні.* У жанчыны, якая ня паліць, але яе партнэр паліць у яе прысутнасьці, верагоднасьць разьвіцьця сардэчна-сасудзістых захворваньняў ў два разы вышэйшая за тую, чый партнэр гэтага ня робіць. Калі на жанчыну ўзьдзейнічае чужы дым ня толькі дома, але й на працы, гэтая пагроза ўзрастае ў два з паловай разы ў параўнаньні зь верагоднасьцю для жынчын, што жывуць у нармальным атачэньні.

*Рак лёгкіх.* У асноўным паражае менавіта курцоў. У той жа час у людзей, што ня паляць самі, але паляць пасіўна, рызыка захварэць на рак лёгкіх на 10-30 працэнтаў вышэй, чым у тых, хто пазьбягае пасіўнага паленьня.

*Менш небясьпечныя захворваньні.* Кожнаму, хто хоць раз правёў вечар у пракураным памяшканьні, вядома, што пры пасіўным паленьні можа ўзьнікнуць рэзь у вочах, пяршэньне ў горле, становіцца цяжка дыхаць. У людзей, якія пакутуюць на астму, аддышка становіцца мацнейшай, чым звычайна.

Жанчыны, якія паляць падчас цяжарнасьці, рызыкуюць не данасіць дзіця.

Немаўля ў маці, якія паляць, важаць у сярэднім на 200 г. меней, чым дзеці такога ж узросту, якія нарадзіліся ў маці, што ня паляць. Такія дзеці часьцей за ўсё адстаюць у фізычным разьвіцьці.



Паленьне бацькоў можа стаць прычынай таго, што дзіцёнак нарадзіцца мёртвым. Паводле статыстычных зьвестак, у жанчын, якія паляць нават мала (ад 1 да 9 цыгарэтаў на дзень) сьмяротнасьць навароджаных на 20,8% вышэй, чым у тых, якія не паляць. І гэтая лічба павялічваецца да 25,9%, калі жанчына выпальвае больш за 10 цыгарэтаў на дзень. А гэта значыць, што выпальваньне паўпачка цыгарэтаў на дзень вядзе да нараджэньня мёртвага дзіцёнка ў кожным чацьвёртым выпадку.

Дзеці бацькоў, якія паляць, часьцей хварэюць на алергічныя захворваньні (напрыклад, экзэму).

Дзеце курцоў часьцей падхопліваюць рэсьпіраторныя інфэкцыі (бранхіт, пнэўманія), часьцей і ў больш цяжкіх формах хварэюць на астму.

Унутры адной і той жа сацыяльнай групы акадэмічныя посьпехі дзяцей зь сямей, дзе паляць, горшыя (а наведваньне школы ніжэйшае), чым у дзяцей, чые бацькі ня паляць.

**Як гэта прынята ў Ангельшчыне**

*Школы.* Звычайна настаўнікі пазьбягалі паліць у прысутнасьці вучняў нават у тыя часы, калі паленьне было больш модным. Сёньня Нацыянальны саюз настаўнікаў Ангельшчыны забараняе выкладчыкам паліць на спартовых пляцоўках і ў тых месцах у школе, дзе іх могуць заўважыць вучні.

*Грамадзкі транспарт.* У лёнданскім мэтро, аўтобусах і цягніках Паўднёвага аддзяленьня брытанскай чыгункі паленьне цалкам забароненае. Паленьне забароненае таксама й на большасьці мясцовых авіяліній. У цягніках мясцовых маршрутаў яно абмежаванае спэцыяльна адведзенымі для гэтага вагонамі. Кіроўца таксі можа папрасіць пасажыраў не паліць, але нічога ня зможа зрабіць, калі яны ўсё-ткі запаляць.

*Рэстарацыі.* Законаў, якія б абаранялі людзей, што жадаюць ня дыхаць падчас яды дымам ад чужых цыгарэтаў, на жаль, не існуе. Вэнтыляцыя ў памяшканьнях рэстарацый павінна адпавядаць парадам Дэпартамэнту навакольнага асяродзьдзя, але і ня больш за гэта. Зараз ідзе кампанія ў падтрымку забароны паленьня ў мясцовых сямейных рэстарацыях.

*Музэі.* У большасьці музэяў Ангельшчыны паліць забаронена, ды і ў тых, дзе гэта можна, наведнікі ад гэтага ўхіляюцца. Дзіўна, што людзі здольны абмяжоўваць сябе дзеля неадушаўлёных рэчаў, але ня дзеля сяброў і навакольных!

**За й супраць!**

Некаторыя ўстановы абароны правоў чалавека і, у прыватнасьці, падлеткаў, выступаюць супраць любых забаронаў і абмежаваньняў паленьня. Яны заяўляюць пра існаваньне моцнага антытытунёвага лобі і абвінавачваюць спэцыялістаў і мэдыкаў (асабліва амэрыканскіх) у падтасоўцы вынікаў розных дасьледаваньняў. Але самі дактары, якія наглядзеліся на хворых з сардэчна-сасудзістымі, лёгачнымі і іншымі захворваньнямі, пераканаными, што ў тых, хто ня паліць, яны ўзьнікаюць радзей ды й працякаюць у больш лёгкіх формах. Да таго ж экспэрымэнты на жывёлах пацьвярджаюць шкодны ўплыў некаторых складнікаў тытунёвага дыму на жывыя арганізмы.

У тытунёвым дыме існуе больш за 4000 газападобных рэчываў. Найбольш шкодныя зь іх – вокіс вугляроду й цыяністы вадарод.

Нікатын і вокіс вуглярода, стала ўзьдзейнічаючы на арганізм, павялічваюць верагоднасьць захворваньняў сардэчна-сасудзістай сыстэмы.

Арганізм пасіўнага курца долей пазбаўляецца ад нікатыну, бо ён менш адаптаваны да спажываньня апошняга.

Лічыцца, што менавіта смолы – сумесь часток, што ёсьць у тытунёвым дыме,– нясуць адказнасьць за павышаную верагоднасьць узьнікненьня раку лёгкіх.

У тытунёвым дыме існуе больш за 43 розныя рэчывы, з-за якіх можа ўзьнікнуць рак.

PROMENADE

# У Краіне Памежных Замкаў

Маладэчна — Беняконі — маршрут у 170 кілямэтраў, на якіх не сустрэнеш помніка Леніну, дзе беларусы суседзяць зь беларусамі, падзеленыя між сабою дзяржаўнай мяжою Літоўскай Рэспублікі. Тут наймацней адчуваюць, што такое Радзіма. Мы з прыяцелем узялі ровары і «зрабілі» гэтыя 170 кілямэтраў. Дзякуючы высілкам журналістаў, Маладэчна атрымала славу найбеларускага й найдэмакратычнага гораду краіны. У гэта ня цяжка паверыць, калі ў электрычцы Менск-Маладэчна сустракаеш двух кантралёраў: дзяўчыну-хіпі й сівога дзядулю адміральскага выгляду, які размаўляе толькі па-беларуску. Але прыстаўку «най-» я пакідаю для рэйтынгаў будучыні. А пакуль... Наша першая начоўка — каля Беніцы, на мяжы Маладачанскага й Смаргонскага раёнаў. Раніцою мы ўяжджаем у край, дзе людзі спрадвеку слова ГОРАД асацыявалі ня зь Менскам і не з Варшавай, а зь Вільняй. На гэтай дарозе мяжа абласьцей прыпадае на гару, якая дамінуе над усёй ваколіцай. З усіх бакоў бачны знак памежжа — нейкі дужа адмысловы крыж. Гэта не зьдзіўляе, бо мы рушым у беларускі Край Крыжоў. Уразіла іншае: пад'ехаўшы да канструкцыі, мы зразумелі, што крыж перароблены — людзьмі ці прыродай — з бэтоннага знаку, які раней абвяшчаў пра пачатак зямельнай юрысдыкцыі калгасу «имени Александра Невского». Ня дзіва, што менавіта тут будаваўся супрацькрыжацкі абарончы ланцуг замкаў ад Трокаў да Наваградка — большых пагоркаў ня знойдзеш па ўсёй Беларусі. Самая яркая неспадзеўка — краявід Крэва. Знаёміцца з гэтым местам трэба толькі з маладачанскай дарогі. Яна выводзіць на Юр'еву гару, зь якой раптоўна адкрываецца краявід з Замкам. Сёньня ў Крэўскім замку надзвычай чыста й ахайна, што характэрна для ўсяго мястэчка. Здаецца, што самы сталы наведнік замку — прыгожы гняды конь, што пасьвіцца ля паўднёвага муру. Ён не выглядае недарэчна — хіба можа конь быць чужынцам у замку? Мы пакінулі замак, калі там зьявіліся «туристы» — бабруйскія школьнікі, якім пачалі распавядаць пра нямецкую агрэсію і пра нейкіх вельмі неакрэсьленых «предков».

Наперадзе — Гальшаны. Мы раскладаем намёт блізу ўказальніка «Памежная зона. Уезд па прапусках». Заўтра мы сумленна ўвойдзем у неўязную зону, а пакуль знаёмімся зь мясцовым камбайнёрам. Размова йдзе ў далёкім ад рамантыкі, але важным для падарожніка, рэчышчы. Па-першае, дождж будзе. Па-другое, памежная зона сьмеху вартая, маўляў, не зьвяртайце, хлопцы, увагі. Ну а сканчаецца размова, натуральна, палітыкай. І я не зьдзіўляюся таму, што у гэтым рэгіёне, як нідзе ў Беларусі, шмат прыхільнікаў апазыцыі. Раніца. Сёньня мы даведаемся пра невялікі кур'ёз: забаронная памежная зона, якая пачалася за 25 км ад мяжы, скончыцца за 14 км ад гэтай самай мяжы, на сутыку Ашмянскага й Іўеўскага раёнаў. Асэнсаваць гэта цяжка, калі ня ведаць, што папераджальныя ўказальнікі ставіліся акурат перад прыездам у Ашмянскі раён прэзыдэнцкай праверкі. Зрэшты, бываюць бязглузьдзіцы больш сумныя. Я маю на ўвазе лёс Гальшанскага замку. Руіны Гальшанскага замку, бадай, самыя маляўнічыя з тых, што я бачыў у Беларусі. Да іх амаль немагчыма падабрацца з-за гушчару зарасьцяў. Калі патрапляеш усярэдзіну, апынаесься ў мазаічнай ірэальнасьці выгбаў, скляпеньняў і сьцянных праломаў. Але веданьне таго, што яшчэ пасьля вайны замак ня проста стаяў, але жыў паўнавартасным жыцьцём, перакрывае ўсялякія эстэцкія пачуцьці. Хто й навошта зьнішчаў палац? Сёньня кароўнік, збудаваны з цэглы палаца, стаіць паўкінуты, бо няма кароваў, клюб з той



жа цэглы — паўпусты, бо няма моладзі. Крэўскі замак чысты й ахайны, Гальшанскі — занядбаны, з «колялюбитленами» на сьценах.

Мы ў Іўеўскім раёне. Геранёны незвычайная вёска. Калісьці яна мела магдэбурскае права, адпаведна — ўласны герб. Герб таксама незвычайны. Па-першае, ён ніякім чынам ня ўпісваецца ў эўрапейскія геральдычныя правілы — на ім, гэтаксама як на бэсэсэраўскім сьцягу, спалучаныя чырвоны зь зялёным, па-другое, дагэтуль незразумелы сэнс выяўленага сэрца, прабітага мячом. Геранёны дзіўная вёска. Яшчэ здалёк вы заўважаеце сымбаль ейнай адметнасьці — вялікае аглядальнае кола, якое значна перавышае касьцёл, што стаіць побач. Што зьбіраліся зь яго аглядаць? Зараз гэтае кола, натуральна, іржавее.

У чым нельга давяраць мясцовым жыхарам, дык гэта ў азначэньнях старажытнасьцяў. У Гайцюнішках ніхто ня ведае «дом-крэпасьць», але кожны пакажа «старую вар'ятню», у Крэве і ў Лідзе на запытаньне пра «замак» вас правядуць да «крэпасьці» й г.д. Натуральна, у Геранёнах ніхто ня ведаў ніякага замку. Мы скарацілі наш шлях да Гайцюнішак амаль удвая. Але аб гэтых рэчах трэба казаць ва ўмоўнай форме, таму што прыклад Славаміра Адамовіча сьведчыць пра спэцыфічнае ўспрыняцьце пэўнымі органамі мастацкіх і дакумэнтальна-мастацкіх (эсэістычных) тэкстаў.

Па лясной дарозе ехаць на ровары значна зручней, чым па разьбітай трактарамі жвіроўцы. Спыняесься перад канавай, што рэжа дарогу на дзьве часткі. Пасьля нядоўгіх развагаў робіцца выснова — мяжа недалёка, але ж дзе жвіроўка на Навіянку, абяцаная старым вартаўніком? Гэта высьвятліцца ў бліжэйшай вёсцы, у якую трэба патрапіць як мага хутчэй, бо скончылася вада. Нечакана псуюцца абодва ровары. Чуваць брэх сабакі. Аб набліжэньні да людзей сьведчыць таксама крыж на раздарожжы (які ўжо па ліку?), стары, нібы зроблены падчас хросту Літвы. Што да Літвы, адчуваецца штосьці незвычайнае ў селішчы, што паўстае на выезьдзе зь лесу: вёска — ня вёска, хутар — ня хутар. Ля бліжэйшай хаты грузавік зь літоўскім нумарам... Унутры штосьці затрымцела ад здагадкі. Раптам з-за сьвірану выскоквае вайсковы грузавік, відавочна не савецкай мадэлі, у ім двое ў нязвыклай уніформе. Словы «лаба дена» й руля аўтамата... Так і ёсьць — ты дыхаеш «паветрам свабоды», ты ў Літве!

Падыходзіш, тлумачыш — заблукалі, праблемаў не ўзьнікае. Вам прыхільна паказваюць на мапе месца знаходжаньня, і жадаюць шчасьлівай вандроўкі, без аніякае праверкі дакумэнтаў і дагляду рэчаў. Самае сьмешнае, што вас заўважылі абсалютна выпадкова, калі вярталіся з развозу патрулёў. Аб гэтым размаўляеш з тамтэйшымі жыхарамі, якія спачувальна тлумачаць, як зручней скіравацца на Гайцюнішкі зь іхняй вёскі (усё-ткі гэта вёска) Качаны. У іх цудоўная беларуская мова, і сум у вачох, калі пытаесься пра цяперашняе жыцьцё ў Літоўскай Рэспубліцы: «Вы ж бачыце — усё запушчанае». Што на гэта можна адказаць, хіба прапанаваць экскурсію ў Беларусь?

Перад намі на пагорку занядбаны кароўнік, за ім, па сьведчаньні качанцаў, ляжыць вёска Сьлёзкі. З пагорка яшчэ раз глядзім на Літоўскую Рэспубліку, на хаты суайчыньнікаў, і на даляглядзе заўважаем Геранёнскае аглядальнае кола. Халера! Ну й забаву прыдумалі сабе адмыслоўцы-геранёнцы — бяры бінокаль, і глядзі сабе: у якія кусты Чэсь павёў Марылю, на якім хутары гоняць самагонку, якой дарогай рушаць кантрабандысты, дзе ў той час памежнікі... Праз паўгадзіны перад намі паўстаюць Гайцюнішкі.

Гайцюніскі дом-крэпасьць — адно з самых страшных месцаў у Беларусі. Тут утрымліваюць вар'ятаў рэцыдывістаў-забойцаў. Але страшнае месца ня толькі з-за гэтага, галоўнае — ніхто ня ведае, колькі здаровых людзей туды патрапляе штогод. Калі зэк застаецца грамадзянінам з частковым абмежаваньнем правоў, тут чалавек — жывёла. Адсюль ніколі не вяртаюцца. Тут мы сустрэлі міліцыянта з гербам Менску на нашыўцы, канваіра, пэўна. Жаданьне было адно — хутчэй уцячы. Замест заплянаванае начоўкі ў Гайцюнішках, мы у Беняконях зьлёту ўскокнулі ў дызэль на Ліду.

Бог падарыў нам каменьне, каб мы збудавалі Замкі. Зь іх пачынаецца наша Радзіма, якая жыве, пакуль дыхаюць старыя камяні.

**Севярын Квяткоўскі**




Конкурс



1

# Якой веры?

Нашаніўцы першае пары былі б, напэўна, моцна зьдзіўленыя, каб даzналіся пра сёньняшнія міжканфэсійныя дэбаты. На пачатку XX ст. рэлігія заняла ў Беларусі сваё пэўнае месца. Ніхто ня корпаўся ў сваіх генэалёгіях, бо кожнаму было ясна, хто ён і якое веры. Гэтае веданьне не давала нікому аніякіх дывідэндаў, апроч пачуцьця камфорту ад усьведамленьня свайго кораню і свайго права на выбар.

Многія беларускія адраджэнцы былі каталікамі. Альгерд Абуховіч, Францішак Аляхновіч, браты Луцкевічы былі рэфарматамі, альбо, інакш кажучы, кальвіністамі. Карусь Каганец быў лютаранінам, а Зьмітрок Бядуля — юдэем. Між тым, усім гэтым людзям нішто не замінала працаваць разам, ствараючы «Нашу Ніву», думаць пра адзіную Беларусь.

Кароткая эпоха талеранцыі, якая запанавала пасьля 1907 году, раскрыла неабсяжны патэнцыял беларускіх рэлігійных традыцыяў. Паліфанія розных перакананьняў, стыляў і звычаяў надавала Беларусі той каларыт, сярод якога можна было верыць у гэткую ж унікальную і прыгожую будучыню. Мноства бажніцаў усіх эўрапейскіх канфэсіяў былі неад'емнай часткаю побыту беларусаў на пачатку стагодзьдзя. Мноства альтэрнатываў... Толькі ў Менску было дзесяць праваслаўных цэркваў і два манастыры, сем каталіцкіх касьцёлаў, дзьве лютаранскія кірхі, царква стараавераў, мячэт і... восемьдзесят дзьве сынагогі разам з малельнымі жыдоўскімі дамамі.

У новым конкурсе мы прапануем Вам мікрапанараму бажніцаў розных веравызнаньняў, якія існавалі ў Беларусі, але тых зь іх, якія былі пабудаваныя на пачатку XX ст. Гэта значыць, што ім сёньня было б столькі ж гадоў што і нашай газэце...

Ваша задача — назваць месца і год пабудовы, вызначыць яе канфэсійную прыналежнасьць. Мы чакаем адказаў, а Вас чакаюць прызы.

***P.S.*** *Адказы на пытаньні папярэдняга конкурсу будуць зьмешчаныя ў наступным нумары.*

**Сяргей Харэўскі**

## Пошта

Ёсьць на Ельшчыне шнары-напамінкі ліхалецьця трыццатых гадоў. Пісягом Валаўск – Белагоркі – Гнойнае – Дубраўкі –Стадолічы зеўраюць надаўбні з жалеза й бэтону. На задуму мандрылаў у скуранках даўгачасныя вагнявыя збудаваньні мусілі спыніць навалу з Захаду.

Пераказваю ўспаміны бацькі. Скончылася калатнеча ў грамадзянскую брыдоту. За дзясяткі вёрстаў палякі з дроту і калючак гэпнулі мяжу. Неўзабаве ў Новым Хутары, Валаўску, Шыі засноўдалі пахмурныя гіцлі. Прынюхваліся, калупалі зямлю, лузалі дрэвы. У трыццаць другім, натужна равучы, пацягнуліся сьмярдзючыя ЗІСы, напіналіся фурманкі, падводы. Усчаўся вэрхал зь ляскатам, выбухамі, як сабачы брэх, загадамі. Вайскоўцы ды цывільныя зарывалі ў амшарынах, на пагорках пагрозьлівыя буданы. Секлі лес, клызьнілі дарогі, нявечылі пашу, пакосы, нівы. Зь ляку тутэйшыя маўчалі. Хто й капейчыну прыдбаў, возячы валамі камяні з чыгункавае станцыі Славечны. Праз колькі часу гамузаваньне аціхла. Бранявыя бельмы вышчарыліся рулямі кулямётаў. Толькі паткніся немчура! І што? У 41-м гэткія «шнуры Манэргейму» нават вока не запарушылі фашыстоўцам.

Скончылася агідная вайна. Прызвычаіўся паляшук да помнікаў-мерцьвякоў. Адно не загойваецца рана згубы й марнатраўства з тае пары.

**Мікола Зімнік,**
*Мазыр*

© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5100 Нумар падпісаны ў друк 19⁵⁵, 25/8/1996. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 4808 Кошт свабодны.